# ЛЮБЛІНСКАЯ ЎНІЯ 1569 г.
# (перадумовы заключэння, наступствы)

***А. І. Голубева***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

Праблема дзяржаўных уній Вялікага княства Літоўскага і Польшчы даследавалася многімі беларускімі, польскімі і расійскімі гісторыкамі. Сярод даследчыкаў гэтай праблемы існуе вялікая колькасць разнастайных, часам супрацьлеглых поглядаў на адны і тыя ж гістарычныя падзеі і факты. Да таго ж многія пытанні гэтай тэмы ў літаратуры асвятляюцца аднабакова, прадузята. Актуальнасць і важнасць тэмы даследавання падкрэсліваецца вялікім значэннем і ўплывам дзяржаўных уній Вялікага княства Літоўскага і Польшчы на далейшае жыццё і развіццё гэтых краін.

Унія (ад позналацінскага unio – аб'яднанне, адзінства) мае некалькі значэнняў: унія дзяржаўная, унія царкоўная, унія як назва розных адміністрацыйных міжнародных саюзаў. Дзяржаўная ўнія – гэта аб'яднанне, саюз дзяржаў. Адрозніваюць асабістую і рэальную дзяржаўныя ўніі. Асабістая (персанальная) унія – саюз дзвюх або некалькіх дзяржаў пад уладай аднаго манарха пры захаванні ім пэўнай самастойнасці ва ўнутранай і знешняй палітыцы. Рэальная ўнія – гэта стварэнне на падставе дагавора або аднабаковага акта федэрацыйнай або канфедэрацыйнай дзяржавы з адзінымі органамі вышэйшай улады і кіравання, арміяй, унутранай і знешняй палітыкай.

Перадумовамі Люблінскай уніі 1569 г. былі: доўгае існаванне персанальнай уніі Вялікага княства Літоўскага і Польшчы, пачынаючы з 1385 г., паступовае збліжэнне палітычных і дзяржаўных інстытутаў абедзвюх дзяржаў, у асноўным адзіная палітыка ў міжнародных адносінах, адзіная адміністрацыя каталіцкай царквы. Прычынамі заключэння Люблінскай уніі з'яўляліся таксама ўнутрыпалітычны крызіс у Вялікім княстве Літоўскім, жаданне Польшчы захаваць персанальную ўнію дзеля атрымання новых земляў, пашырэння ўплыву каталіцкай царквы. Непасрэднай прычынай заключэння Люблінскай уніі былі няўдачы войска Вялікага княства Літоўскага ў час першага перыяду Лівонскай вайны 1558–1583 гг. На такія прычыны заключэння Люблін-

скай уніі 1569 г. звяртаюць увагу большасць даследчыкаў: А. Ф. Вішнеўскі, А. П. Грыцкевіч, М. В. Доўнар-Запольскі, У. М. Ігнатоўскі, П. Лойка, М. К. Любаўскі, І. Ю. Увараў, В. Чаропка, М. Ермаловіч, Я. А. Юхо і некаторыя іншыя.

Паводле ўмоў Люблінскай уніі Вялікае княства Літоўскае і Польшча аб'ядналіся ў адну дзяржаву – Рэч Паспалітую. Персанальная ўнія ператварылася ў рэальную. Аднак Рэч Паспалітая стала не ўнітарнай, а канфедэратыўнай дзяржавай, у кампетэнцыю якой уваходзілі толькі пытанні агульнай знешняй палітыкі. Вялікае княства Літоўскае і Польшча ў выніку гэтай уніі захавалі сваю адасобленасць. Унія спрыяла перамозе Вялікага княства Літоўскага ў Лівонскай вайне, захаванню яго як дзяржавы. Адмоўным яе вынікам было ўзмацненне паланізацыі беларускага насельніцтва.

Люблінская ўнія была кампрамісам феадалаў Польшчы і ВКЛ, у выніку якога ўтварылася больш моцная дзяржава. Унія замацавала палітычнае адзінства абедзвюх дзяржаў, узмацніла працэсы іх эканамічнага і культурнага збліжэння. Шляхта ВКЛ захавала свае саслоўныя прывілеі. Магнаты ВКЛ хоць і страцілі былыя пазіцыі ў кіраванні дзяржавы, але захавалі свае латыфундыі, вышэйшыя дзяржаўныя пасады і палітычны ўплыў. Клас феадалаў ВКЛ у цэлым выйграў ад заключэння ўніі. Скончылася перамогай Інфлянцкая вайна. Унія фактычна існавала да 3-га падзелу Рэчы Паспалітай (1795).

Такім чынам, заключэнне Люблінскай уніі паміж Вялікім княствам Літоўскім і Польшчай у цэлым мела станоўчыя вынікі: спрыяла развіццю і збліжэнню гэтых краін, правядзенню імі эфектыўнай знешняй палітыкі, існаванню і захаванню гэтых дзяржаў як адных з мацнейшых дзяржаў у Еўропе.